

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 31 (155) 25 снежня 1990 года


**ДРУГІ РЭСПУБЛІКАНСКІ СТУДЭНЦКІ ФОРУМ**

**ВАЧЫМА ДЭДЕГАТА**

## Былі і слушныя прапановы



Завяршыў работу 2-гі Рэспубліканскі форум студэнтаў. У мінулым нумары мы пазнаёмілі вас з асноўнымі арганізацыйнымі момантамі форума. Сёння ж у нас у гасцях адзін з дэлегатаў форума — В. Холад, студэнт 4 курса факультэта правазнаўства. Мы папрасілі яго расказаць аб рабоце форума, падзяліцца сваімі ўражаннямі.

— Работа форума была насычанай. Спадабалася тое, што ўсе былі заняты справай. Думаю, так і павінна быць, на форум сабраліся зацікаўленыя людзі. Трэба адзначыць, што форум праходзіў у той час, калі, у сувязі з пераходам да рынaчных адносін, накапілася шмат пытанняў, праблем і ў арганізацый, і ў саміх студэнтаў. Ужо вядома, што вялікая доля цяжкасцей прыйдзецца на малазабяспечаны слой грамадства, у тым ліку і студэнтаў. Таму пры ўсіх сваіх праблемах, я думаю, што лепш сабрацца ўсім разам (і студэнтам, і кіраўніцтву рэспублікі), каб вырашыць іх, чым аб'яўляць галадоўку і ставіць палаткі на плошчах. Трэба ў дыскусійнай форме вырашаць пытанні, якія нас хвалююць.

Ужо ў першы дзень работы дэлегаты сустрэліся са Старшынёй Савета Міністраў БССР В. Ф. Кебічам, які расказаў аб сітуацыі, якая склалася ў краіне і ў рэспубліцы. Разбалансаванасць эканомікі, дэфіцыт бюджэту, таварны голад — такія рэаліі сённяшняга дня. Як жа ў такой сітуацыі абараніць інтарэсы студэнта ад стыхіі несфарміраваўшагася рынку? В. Ф. Кебіч не крывіў душой, гаварыў прама, прапаноўваў выступаць, выказваць свае меркаванні і прапановы, адказваў на пытанні дэлегатаў. Ён падвёў вынікі работы за мінулы год пасля І-га Рэспубліканскага форума студэнтаў. Па выніках мінулага года відаць, што ўсе слушныя прапановы былі ўлічаны і выкарыстаны ўсе магчымасці для іх рэалізацыі. Няма падставы сумнявацца ў тым, што намечаныя пытанні будуць вырашаны. Трэба зыходзіць з рэальных абставін. Зараз мы атрымліваем ад кіраўніцтва рэспублікі тое, што яно яшчэ можа даць, а патрабаваць большага, ведаючы, што ў такі напружаны час дапамога ўрада больш патрэбна інвалідам, дзецям, якія панеслі ўрон пасля землятрасенняў і аварыі на Чарнобыльскай АЭС, мы проста не можам.

Шмат цікавага было на форуме, але сказаць, што ўзнікалі нейкія вострыя, крызісныя моманты, калі б студэнты ўступалі ў канфлікт з кіраўніцтвам, не магу. Праўда, былі спрэчкі, часцей неабгрунтаваныя канкрэтнымі фактамі. Часта выступалі прадстаўнікі БНФ з радыкальнымі прапановамі, не пацверджанымі рэальнымі абставінамі. Была прапанова павысіць стыпендыю студэнтаў да мінімальнага ўзроўню заработнай платы, а прадстаўнікі БНФ прапаноўвалі павысіць яе да сярэдняй заработнай платы з наступнай выплатай у час працы. Адзін з дэлегатаў прапанаваў праект рэзалюцыі, якую назваў «палітычнай рэзалюцыяй», дзе гаварылася, што наступіў палітычны, эканамічны крызіс, што мы падыйшлі да таго моманту, калі трэба дзейнічаць і выбіраць: «сёння» або «ніколі». Форум не падтрымаў іх прапановы, не зацвердзіў рэзалюцыю, якая была названа палітычнай правакацыяй. Я, напрыклад, згодзен, што крызіс ёсць як і ўсюды. Але думаю, што прымаць такую рэзалюцыю, якая фактычна заклікае да забастовак, мы не можам, бо ўсе нашы прапановы былі падтрыманы ўрадам рэспублікі, што пры рынку мы ўсё ж знойдзем шляхі да рэалізацыі нашых праблем, намечаныя прапановы будуць выкананы.

Але не ўсе пытанні, якія хацелася б пачуць, былі закрануты на форуме, напрыклад, пытанне аб пераглядзе самой камсамольскай арганізацыі, думаю, што трэба змяніць назву, але гэта справа ў цяперашніх умовах вельмі складаная і мае свае тонкасці. Не было разгледжана пытанне аб адносінах студэнцкіх арганізацый да камсамола, падымалася пытанне аб стварэнні асобнай студэнцкай арганізацыі, але было вырашана перанесці яго на наступны, ІІІ-ці форум.

З прапановамі ад нашай дэлегацыі выступіў К. Шпектараў. У ходзе работы форума быў створаны выканаўчы камітэт, у які ўвайшоў наш дэлегат В. Філіпчык.

На форуме прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх вышэйшых навучальных устаноў. З размовы з імі я зразумеў, што вялікай розніцы ў існуючым становішчы паміж установамі няма. Мы з'яўляемся аднымі з першых, у каго наладжаны выездны гандаль для студэнтаў. Наогул, працоўны дзень быў так загружаны, што не заставалася часу на гутаркі.

Пасля пленарнага пасяджэння, на якім вырашаліся арганізацыйныя пытанні, удзельнікі студэнцкага форума працавалі ў дыскусійных цэнтрах, дзе абмяркоўваліся праблемы перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы, праект закона «Аб адукацыі ў Беларускай ССР», праблемы сацыяльнай абароны студэнтаў ва ўмовах пераходу да рынaчных адносін, ішла размова аб арганізацыйным афармленні студэнцкага руху ў рэспубліцы... Прыняты выніковыя дакументы студэнцкага форума.

Распрацаваны і прадстаўлены Вярхоўнаму Савету рэспублікі праект Закона аб сацыяльнай абароне моладзі. Не належаць налогаабкладанню стыпендыі студэнтаў, а таксама ўсе стыпендыі, устаноўленыя рознымі фондамі. Не будзе брацца падаходны налог з заработку студэнтаў, занятых на сельскагаспадарчых работах. З улікам інфляцыі студэнтам будзе выплачвацца розніца паміж стыпендыяй і мінімальнай заработнай платай. Прадугледжаны льготныя білеты для праезду на транспарце і на відовішчныя мерапрыемствы ў выхадныя дні.

Увогуле, работай форума я задаволены, т. ш. усе прапановы студэнтаў былі прыняты ўрадам. Лічу, што менавіта ў такой форме павінны вырашацца ўсе нашы праблемы.

**В. ХОЛАД.**



**По инициативе Всемирного Совета мира Советский комитет защиты мира проводит акцию в пользу запрета всех видов ядерных испытаний, представляющих серьезную угрозу безопасности многих стран не только с точки зрения экологии, но и как один из способов совершенствования ядерного оружия. Публикуем вырезной купон с текстом обращения, под которым каждый читатель мог бы поставить свою подпись и направить в СКЗМ.**

### ТРЕБУЮ ПОЛНОГО ЗАПРЕТА ИСПЫТАНИЙ ЯДЕРНОГО ОРУЖИЯ ВО ВСЕХ СРЕДАХ!

Призываю правительства всех стран ввести этот запрет на конференции в ООН по дополнению московского Договора 1963 года о запрещении ядерных испытаний на земле, под водой и в космосе.

Фамилия, имя, отчество

Профессия

Вырежьте и отошлите в ближайшие дни это обращение по адресу:

129010, Москва, проспект Мира, 36

Советский комитет защиты мира.

Ваши подписи под этим воззванием будут доставлены в Нью-Йорк, в Организацию Объединенных наций, где в январе 1991 года в ходе международной конференции с участием 113 государств будет обсуждаться вопрос о дальнейшей судьбе ядерных испытаний.

# і функцыянальныя даследаванні

Кафедра радыёфізікі была арганізавана 1 верасня 1985 года яшчэ на фізічным факультэце. З 'явілася спецыялізацыя радыёфізіка ў агульнай педагагічнай спецыяльнасці фізіка. На кафедры працавала 4 выкладчыкі і 2 лабаранты. І была адна група студэнтаў. Ніякай навуковай працы не вялося, усё прыходзілася пачынаць з нуля.



Заняткі вядзе Юрый Расціслававіч Бейцюк.

У тым жа 83-ім, пачатку 84-га года рэктар паставіў перад намі задачу: размеркаванне выпускнікоў на фізічным факультэце павінна быць толькі на вытворчасць. Гэты напрамак у рабоце і быў прыняты нашай кафедрай і кафедрай прыкладной оптыкі. Спачатку праехалі па заводах, высветлілі патрэбу ў спецыялістах. Тады ж было арганізавана вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне.

Работа адразу пайшла ў двух напрамках: падрыхтоўка выпускнікоў і навуковая работа для прадпрыемстваў. Наша кафедра стала супрацоўнічаць з двума заводамі: аўтамагнітол і «Радыёпрыбор». Адразу вызначыліся ў навуковых раздзелах. Так, мы сталі займацца аўтаматызацыяй розных кантрольных аперацый, гэта значыць, рабілі аўтаматычныя кантрольна-вымяральныя стэнды. Вырабляем іх для нашых прадпрыемстваў і да гэтага часу, а таксама для завода «Гандальмаш», для нашых калгасаў, спартсменаў, іншых заказчыкаў.

Другі бок супрацоўніцтва з заводамі — падрыхтоўка студэнтаў,— ужо ў пачатку 1985 года выявілі тое, што неабходна мяняць спецыяльнасць нашых выпускнікоў. Мы гэта зразумелі раней, другім прыйшлося доказваць на розных узроўнях дзеля таго, каб адкрыць новыя спецыяльнасці. А час ішоў.

Такім чынам, у 1988 годзе была адкрыта спецыяльнасць радыёфізіка і электроніка. Чым яна добрая? Справа ў тым, што яна можа быць рэалізавана ў двух варыянтах: у чыста тэхнічным сэнсе для вытворчасці па плану палітэхнічных інстытутаў, і ў другім: навуковая работа, універсітэцкі план падрыхтоўкі.

Мы цяпер так і робім. Большая частка нашых студэнтаў рыхтуецца па тэхнічнаму плану навучання. Яны атрымліваюць кваліфікацыю радыёінжынера і размяркоўваюцца на пяць заводаў: аўтамагнітол, «Радыёпрыбор», вытворчае аб'яднанне «Конус», ВА «Стромэкалогія» і ў абласное ўпраўленне сувязі. Вельмі шмат выпускнікоў ідзе па асабістых заяўках на невялікія прадпрыемствы, працуюць там у вылічальных цэнтрах, канструктарскіх бюро.

Некаторыя студэнты застаюцца ва універсітэце для прадаўжэння навуковай работы. Яны, як правіла, вучацца па індывідуальнаму плану і атрымліваюць універсітэцкую спецыяльнасць радыёфізіка. З гэтай жа кваліфікацыяй у нас ёсць выпускнікі, якія працуюць у школах (6 чалавек — у Гродна). Водгукі аб іх вельмі добрыя, таму што фізіку яны ведаюць не горш нашых педагогаў. А што датычыцца тэхнікі, а яе цяпер у школах шмат,— то тут яны па-за канкурэнцыяй. Магчыма таму нашых выпускнікоў заўсёды з задавальненнем бяруць у школы.

За гэтыя 6 гадоў мы выпусцілі каля 300 чалавек па спецыяльнасці фізіка са спецыялізацыяй радыёфізіка. А ў 1991 годзе будзе першы выпуск з новай спецыяльнасцю радыёфізіка.

На сённяшні дзень у плане падрыхтоўкі студэнтаў мы ў асноўным робім націск на вылічальную тэхніку, персанальныя ЭВМ, іх абслугоўванне і выкарыстанне ў тэхналагічных працэсах, пры канструіраванні радыёапаратуры, практычна, ва ўсіх сферах. Аказваецца, гэта вельмі ўдала, таму што мікрапрацэсары на сённяшні дзень выцеснілі на прадпрыемствах вялікія машыны. Колькасць іх расце, а граматнасці ў іх прымяненні, умення працаваць няма. Таму і для нашых выпускнікоў ствараюцца спрыяльныя ўмовы для ўладкавання на работу, і на саміх прадпрыемствах устае пытанне аб перападрыхтоўцы інжынераў на мікрапрацэсары.

У плане навуковых работ: пераход да функцыянальных даследаванняў. Гучыць некалькі парадаксальна, таму што асноўны заказ прадпрыемстваў сёння вельмі канкрэтны. Тут не патрабуецца ніякіх фундаментальных даследаванняў, а толькі канкрэтная работа. Мы гэта робім. Але, у той жа час, добра разумеем, што для таго, каб праз пяць гадоў застацца канкурэнтназдольнымі, мы павінны стварыць задзел ужо сёння.

Мы распрацоўваем тры тэмы. Першая: электрадынаміка. Сюды ўваходзяць антэны, радыёхвалі, новыя радыётэхнічныя матэрыялы з кіруемымі параметрамі. Гэта як раз тое, што спатрэбіцца для новай радыёапаратуры, якая пойдзе ў вытворчасць гадоў праз пяць. Сюды ж можна аднесці работы па лазерах. Другая тэма: распрацоўка новых сістэм сувязі. І трэцяя: мікрапрацэсарная тэхніка, сістэмны аналіз. Усе яны маюць сваю мэту ў перспектыве. А задзел, зроблены сёння, дазволіць нам быць канкурэнтназдольнымі ў распрацоўцы новай тэхнікі, на якую мы зможам атрымаць заказы ад прадпрыемстваў. Таму мы павінны думаць гадоў на пяць наперад, каб потым не застацца па-за справамі.



У лабараторыі радыёпрыёмных і перадаючых устройстваў студэнты трэцяга курса інжынернага факультэта Сяргей Ялоўскі, Міхаіл Чывіль і Дзмітрый Рындаў займаюцца апрацоўкай даных лабараторнай работы.

Цяпер у нас працуюць 14 выкладчыкаў, каля 10 чалавек дапаможнага персаналу. На кафедры 8 кандыдатаў навук, трое з іх абаранілі свае дысертацыі ўжо на нашай кафедры. На сённяшні дзень два чалавекі вучацца ў аспірантуры, 4 — саіскальнікі вучоных ступеняў. Прадстаўлена да абароны адна доктарская дысертацыя.

Што датычыцца матэрыяльнай базы, то як маглі, мы яе паднялі. Закуплена новае абсталяванне па ўсіх вучэбных лабараторыях, а іх каля 10, праходзіць там 12 лабараторных практыкумаў. Добрае абсталяванне ў лабараторыях мікрасхемнай тэхнікі, мікрапрацэсарнай, тэлебачання, радыёэлектронных сістэм. Закуплена новае абсталяванне для лабараторый асноў радыётэхнікі, асноў электратэхнікі.

База цяпер ёсць. Але сказаць, што яна дастатковая, нельга. Сёння яна яшчэ можа задаволіць, а заўтра ўжо састарэе. Практычна, яе трэба пастаянна абнаўляць. Але праблема адна: няма грошай. У час застою былі грошы, не было фондаў. Цяпер лепш не стала. Фондаў не патрабуецца, але няма грошай. Гэта звязана з тым, што наша дзяржава не выдзяляе дастаткова грошай на адукацыю, а на «грашы» падрыхтаваць класнага спецыяліста нельга. Толькі для таго, каб нашу спецыяльнасць трымаць на ўзроўні, трэба кожныя пяць гадоў мяняць парк абсталявання. Такіх грошай універсітэт не мае.

Хачу падкрэсліць, што на нашай кафедры здаровае, працаздольнае ядро. Так, у галіне электрадынамікі працуе Уладзімір Андрэевіч Луганін, над сістэмамі сувязі працуе Вячаслаў Мікалаевіч Сюрын, вылічальнай тэхнікай займаецца Валерый Аляксандравіч Ваўчок. На кафедру інжынерна-тэхналагічнай падрыхтоўкі перайшоў ад нас Юрый Расціслававіч Бейцюк. Барыс Аляксеевіч Барыхін прадставіў доктарскую дысертацыю. З лабарантаў хацелася б адзначыць Аляксандра Віктаравіча Есіпка і Людмілу Уладзіміраўну Копачыву. Яны вучацца ў аспірантуры, маюць некалькі публікацый, працуюць і па гаспадарча-дагаворных тэмах. Гэта нашы будучыя выкладчыкі. Вельмі адукаваны спецыяліст інжынер навукова-даследчага сектара Ігар Міхайлавіч Нонча. А бязменны наш Леанід Уладзіміравіч Баярчык, рабочы высокай кваліфікацыі, універсал у сваёй справе, многіх інжынераў яшчэ павучыць можа.

Думаю, што калі б былі неабходныя ўмовы для развіцця вышэйшай школы, усё астатняе мы здолелі б вырашыць самі. А ў тым становішчы, у якім апынулася сёння вышэйшая школа, выкладчыкам і вучоным гаварыць аб нейкіх перспектывах вельмі цяжка. Праблемы, у якія мы сёння ўперліся, агульныя для ўсёй вышэйшай адукацыі. Ні наш рэктар, ні рэктар другой ВНУ нічога не выправяць. Патрэбна фінансаванне вышэйшай школы хаця б на ўзроўні развіваючыхся краін, не гаворачы ўжо пра развітыя. Ніколі мы не зможам дагнаць і перагнаць іх, калі будзем так адносіцца да адукацыі, тым больш тэхнічнай.

Усё гэта праблемы знешнія. Становішча ж на кафедры ў нас здаровае. Мы будзем развівацца далей, пытанне толькі ў хуткасці росту, а ён недастатковы не толькі ў нас.

**Ю. РЫЧКОЎ,**
**загадчык кафедры радыёфізікі.**

## НОВЫЯ ПАДРУЧНІКІ І ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ

Тапалогія: Вучэбны дапаможнік для матэматычных спецыяльных ВНУ.— Мінск, Вышэйшая школа, 1990.

Радыётэхнічныя сістэмы (Пад. рэд. Ю. М. Казарынава.— М., Вышэйшая школа, 1990.

Вішнякоў В. А., Пятроўскі А. А. Сістэмнае забеспячэнне мікра ЭВМ.— Мн., Вышэйшая школа, 1990.

Альсевіч Л. А., Чаранкова Л. П. Практыкум па дыферэнцыяльных ураўненнях.— Мн., Вышэйшая школа, 1990.

**Для студэнтаў факультэта правазнаўства**

Прававая ахова акружаючага прыроднага асяроддзя ў краінах Усходняй Еўропы; вучэбны дапаможнік для ВНУ.— М., Вышэйшая школа, 1990.

Вучэбна-палявая практыка па батаніцы, вучэбны дапаможнік,— М., Вышэйшая школа, 1990.

**Для студэнтаў гістарычнага факультэта**

Карлаў В. В. Уводзіны ў этнаграфію народаў СССР.— М., выдавецтва МДзУ, 1990.

Для студэнтаў, якія збіраюцца на педагагічную практыку, прапануем наступныя кнігі:

1. Сцэнарыі школьных свят /Склад. Л. І. Вінаградава.— М., Асвета, 1990.

У зборнік уключаны сцэнарыі прафесіянальных і самадзейных аўтараў. Матэрыялы зборніка арыентаваныя на школьнікаў розных узростаў і дазваляюць падрыхтаваць тэатралізаваныя прадстаўленні да свят 9 Мая, 1 верасня (да Дня ведаў), а таксама тэматычныя забаўляльна-пазнавальныя вечары, такія, як мастацка-публіцыстычная кампазіцыя «Будзь Чалавекам — Чалавек!» Асноўны змест гэтага сцэнарыя дапаможа дзецям задумацца пра дабро і зло, пра вернасць і здраду. Паказ тэатралізаванага відовішча «Чырвоны, жоўты, зялёны» у жартоўнай форме напомніць дзецям аб жыццёва важных правілах дарожнага руху.

Грэхнеў В. С. Культура педагагічных зносін. Кніга для настаўніка.— М., Асвета, 1990.

Школа, акружаючы дзяцей увагай і дабразычлівасцю, з дзяцінства прывівае ім тым самым высокую культуру чалавечых зносін. Гэта кніга дапаможа вам разабрацца ў тым, што вы ведаеце, і чаго не ведаеце, пабудаваць вашы веды ў сістэму і карыстацца ёй у рабоце.

1990 год з'яўляецца годам Скарыны. Мы прапаноўваем вам дзве новыя кнігі, атрыманыя нашай бібліятэкай.

1. Скарына і яго эпоха. В. А. Чамярыцкі і інш.— Мн., Навука і тэхніка, 1990.

Праца з'яўляецца першай спробай комплекснага вывучэння эпохі Скарыны на аснове навейшых дасягненняў савецкага славяназнаўства. На багатым фактычным матэрыяле асвятляецца скаладаны працэс фарміравання беларускай народнасці, важнейшыя асаблівасці беларускай мовы, літаратуры, мастацтва, грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі на мяжы сярэдневякоўя і Адраджэння.

2. Дакументальная аповесць вядомага даследчыка кнігі і гісторыі кнігадрукарства Нeміроўскага Е. Л.. Па слядах Францыска Скарыны.— Мн., Беларусь, 1990. Кніга расказвае аб тым, як вучоныя Расіі і іншых краін шукалі і знаходзілі кнігі Ф. Скарыны, дакументы аб яго жыцці і дзейнасці, паведамляе цікавыя падрабязнасці аб самім першадрукары і яго кнігах.

Няма на зямлі чалавека, які б не задумваўся над сутнасцю кахання... Можам прапанаваць вам наступныя кнігі.

1. Філасофія кахання. У двух тамах. Пад рэд. Д. П. Горскага.— М., Палітіздат, 1990.

2. У зборнік «А шчасце так магчыма» М., «Известия», 1989. Тут сабраны матэрыялы, надрукаваныя на старонках «Нядзелі», якія выклікалі асаблівую цікавасць чытачоў.

З 24 па 30 снежня ў даведачна-інфармацыйным аддзеле бібліятэкі арганізавана выстава новых паступленняў літаратуры, дзе вы можаце пазнаёміцца з названымі і іншымі навінкамі літаратуры.

**Ф. ЛЕЛЬЧУК,**
**старшы бібліятэкар.**

**БУНИНСКИЕ ДНИ В УНИВЕРСИТЕТЕ**

# *И судьба беспощадно велела...*

**У зверя есть нора, у птицы есть гнездо...**
**как бьется сердце горестно и громко,**
**когда вхожу, крестясь, в чужой, наёмный дом**
**С своей уж ветхою котомкой!**

**И. А. Бунин**

Совесть сегодня велит говорить о тех, кто более всего достоин светлых и благодарных воспоминаний. Слышите? Гремит начищенная медь — и — как всегда — поздно.

Иван Алексеевич Бунин... Как много нам говорит это имя, много и... мало. Позорно мало мы знаем о человеке, ставшем одной из многочисленных жертв наших прежних, незабываемых и навряд ли исправимых ошибок.

Сердце Бунина перестало биться в чужом краю, далеко от Родины, но отдавать дань его светлой памяти должны и мы. Поставьте цветы у его портрета, зажгите свечи, давайте «говорить о печали».

Ивану Алексеевичу Бунину было посвящено одно из занятий литературно-методического кружка, руководит которым Николай Александрович Мельников, заведующий кафедрой русской и зарубежной литературы. Это человек, давший дорогу уже многим поколениям молодых пеподавателей. Он, не скупясь, делится своими многочисленными знаниями и опытом со студентами, не пропускает ни одной литературной новости, помогает в выборе книг, необходимых для развития и усовершенствования личности. Жаль, что мы не всегда умеем это ценить. Так, если бы не это занятие кружка, мы бы многого не узнали о Бунине.

Н. А. Мельников говорил о том, о чем многие годы молчала наша пресса, был дан краткий обзор творчества Бунина.

Одна из самых активных участниц кружка, Наталья Чернявская, рассказала нам о дневнике писателя «Окаянные дни». О каких же днях идет речь? Это были дни полного разрыва с Россией. Как этот человек любил Россию! Не громкой, кричащей любовью, а любовью тонкой, прочувствованной, прочной.

**Грустно видеть, как много страданья**
**И тоски и нужды на Руси!**

И вот оно грянуло — «спасение», явившееся с залпом «Авроры». Все ломалось, рушилось, багряный флаг был окрашен кровью лучших представителей русской интеллигенции. «Власти берегли здоровье людей — вместо 20 капель правды давали 15, так как 20 капель — смертельная доза». Бунин не принял революцию. Он так и не изменил свою политическую позицию до конца жизни.

1918 год. Писатель с ужасом наблюдает за теми изменениями, которые происходят с лучшими умами России. О Брюсове: «Все левеет. Почти большевик». Обидно было ему и за Блока, который, так до конца и не поняв революции, стал слагать ей гимны. В стране царила паника отчаяния...

Писатель не мог больше оставаться в России и покинул ее в 1920 году. Навсегда. Катаев презрительно отозвался о нем: «Уехал хлебать чечевицу в Париж». Не знал тогда еще Валентин Петрович, что ожидает его самого. А если бы не уехал Бунин из России? Что же, почивал бы великий талант на лаврах? Отнюдь. Его уделом стал бы один из лагерей в родном краю и оборвалась бы жизнь человека за решеткой, куда никогда не заглядывало солнце правды.

Счастлив тот, кто жизнью мир пленяет.
Но сто крат счастливей тот, чей прах
Веру в жизнь бессмертную вселяет
И цветет легендами в веках!

О Бунине-поэте говорилось еще меньше, чем о Бунине-писателе. А, между тем, у него очень тонкая, своеобразная лирика. Первые его поэтические книги о Родине, о красоте ее радостной и печальной природы, о зорях лета и пронзительно-грустных закатах осени. У него необычное восприятие мира природы, человека. Горький говорил ему: «Когда я буду писать о Вашей книге стихов,— я, между прочим, буду сравнивать Вас с Левитаном...».

Бунин трагически переживал разрыв с Россией. Поэзия этих лет проникнута настроением одиночества человека, оказавшегося «в чужом, наемном доме», вдали от земли, которую он «любил до боли сердечной».

Золотой недвижный свет
До постели лег
Никого в подлунной нет,
Знает только он мою
Мертвую печаль,
То, что я от всех таю...
Холод, блеск, мистраль.

Бунин покинул нас навсегда, но нет, он возвратился,не мог не возвратиться. Именно об этом говорится в статье «Возвращение», которая была напечатана в «Учительской газете» и с анализом которой выступила на занятии кружка Наташа Здасюк. Слушая ее, мы опять испытали уважение к Бунину и чувство вины, общей обиды за всех нас, за родную землю, пожинающую сейчас плоды своих посевов. Грустно, милые мои, грустно...

Выступила Инна Лось. Она познакомила нас со статьей Бунина «Инония и китеж», напечатанной в 1925 году в парижской газете. «Честь государя заменит вам кнут...». Статья овеяна грустью по России прежней, России Толстых. Посвящена статья Алексею Константиновичу Толстому, творчество которого, как и творчество Афанасия Фета, Якова Полонского, Бунин очень любил. Вот поэтому и была его постоянной спутницей в Париже синеокая ностальгия по той России, которой уже не вернуть, но которая живет в каждом любящем, обогретом ею сердце, откуда ее ничем не вытравить, чей глубокий, грустный голос не заглушить звуками бравурных маршей, чей свет, как маяк, зовет через дальние расстояния и долгие годы одиночества на чужой земле.

**Т. ОБУХОВСКАЯ,**
**студентка 4 курса филологического факультета.**

«Я не знаю, что называется хорошим человеком. Верно, хорош тот, у кого есть душа, есть горячее чувство, безотчетно рвущееся из глубины сердца. Я не знаю, что называется искусством, красотою в искусстве, его правилами. Верно, в том заключается оно, чтобы человек, какими бы словами, в какой форме ни говорил мне, но заставлял видеть перед собою живых людей, чувствовать веяние живой природы, заставлял трепетать лучшие струны моего сердца».

**И. А. БУНИН.**

**НОВОЕ О БУНИНЕ**

# Наша память — наш долг

Итак, 2 ноября состоялось заседание кружка любителей поэзии, посвященное 120-летию И. А. Бунина. На нем звучали стихи, которые в каждом из нас пробуждали неординарные чувства и представления о личности Бунина, о его судьбе — непростой и трудной.

И, может быть, именно сегодня пришло время назвать Бунина великим русским писателем? Не только потому, что он получил Нобелевскую премию, но и по той причине, что первым в XX веке взглянул на Россию, как на целое, первым стремился исторически объективно посмотреть на всех людей, живших до революции.

О Бунине написано немало. Есть и противоречивые суждения. Но не так уж много внимания уделялось той внутренней жизни, которая была характерна для семьи Буниных и сохранилась до сего дня в воспоминаниях Ласкаржевского и в нем самом. И мне думается, что сегодня мы не имеем права забывать о людях, которые приняли участие в восстановлении истинных фактов жизни и деятельности Бунина. Об одном из них сейчас пойдет речь.

Это племянник Ивана Алексеевича Николай Иосифович Ласкаржевский. Наследник старинного рода Буниных, он семнадцать лет провел в сталинских тюрьмах, лагерях, ссылках. Главным обвинением было родство с Иваном Алексеевичем. Обоих — писателя и племянника — следователь называл «врагами народа». О смерти Ивана Алексеевича он и его жена Мария Флориановна Квятковская узнали, еще находясь в Красноярском крае. Помнят, как тяжело было на душе накануне. Николай Иосифович всю ночь ходил, думал, вспоминал, не понимая, что с ним происходит. Потом принесли «Правду» от 11 ноября...

Первым, кто начал почти сразу же по возвращении из ссылки восстанавливать память рода Буниных, был Ласкаржевский. Двадцать лет назад в музей города Ефремова он передал семейные реликвии и подготовленный им альбом. Дом и семья были для Ивана Алексеевича той нравственной опорой, которая не исчезла до последних дней.

«С матерью связана самая горькая любовь всей моей жизни...

В далекой родной земле, одинокая, навеки всем миром забытая, да покоится она в мире и да будет вовек благословлено ее бесценное имя...»

В годы написания «Жизни Арсеньевых» эти строки были пророческими. Нельзя позволить, чтобы были забыты такие могилы!

Бунинская Россия, находящаяся на небольшом пространстве от Ефремова до Воронежа и от Орла до Ельца, расширилась потом до Москвы и Парижа. Бунинский план о России, не услышанный в свое время, горько отозвался в наши дни.

В своем последнем рассказе «Бернар» Бунин пишет: «Бог всякому из нас дает вместе с жизнью тот или иной талант и возлагает на нас священный долг не зарывать его в землю...»

Исполнил свой долг писатель Иван Алексеевич Бунин.

Исполняет его и Николай Иосифович Ласкаржевский.

Наш долг перед ними, перед всем славным родом Буниных еще существует.

**Н. ЗАЙКО,**
**студентка 4 курса филологического факультета.**

## *«... ЗАСИНЕЕТ СОН ВОСПОМИНАНЬЯ...»*

* * *

Осыпаются астры в садах,
Стройный клен под окошком желтеет,
И холодный туман на полях
Целый день неподвижно белеет.
Ближний лес затихает, и в нем
Показалися всюду просветы,
И красив он в уборе своем,
Золотистой листвою одетый.
Но под этой сквозною листвой
В этих чащах не слышно ни звука...
Осень веет тоской,
Осень веет разлукой!
Поброди же в осенние дни
По аллее, давно молчаливой,
И с любовью и с грустью взгляни
На знакомые нивы.
В тишине деревенских ночей
И в молчанье осенней полночи
Вспомни песни, что пел соловей,
Вспомни летние ночи
И подумай, что годы идут,
Что с весной, как минует ненастье,
Нам они не вернут
Обманувшего счастья...

* * *

Я к ней вошел в полночный час.
Она спала, — луна сияла
В ее окно, — и одеяла
Светился спущенный атлас.
Она лежала на спине,
Нагие раздвоивши груди, —
И тихо, как вода в сосуде,
Стояла жизнь ее во сне.

* * *

Спокойный взор, подобный взору лани,
И все, что в нем так нежно я любил,
Я до сих пор в печали не забыл,
Но образ твой теперь уже в тумане.
А будут дни — угаснет и печаль,
И засияет сон воспоминанья,
Где нет уже ни счастья, ни страданья,
А только всепрощающая даль.

* * *

Настанет день — исчезну я,
А в этой комнате пустой
Все то же будет: стол, скамья
Да образ, древний и простой.
И так же будет залетать
Цветная бабочка в шелку —
Порхать, шуршать и трепетать
По голубому потолку.
И так же будет неба дно
Смотреть в открытое окно
И море ровной синевой
Манить в простор пустынный свой.

* * *

Где ты, угасшее светило?
Ты закатилось за поля.
Тебя сокрыла, поглотила
Немая, черная земля.
Но чем ты глубже утопаешь
В ее ночную глубину,
Тем все светлее наливаешь
Сияньем бледную Луну.
Прости. Приемлю указанье
Покорным быть земной судьбе,—
И это горное сиянье—
Воспоминанье о тебе.

Страничку бунинской поэзии подготовила Л. И. Мурзич, старший преподаватель кафедры русской и зарубежной литературы.

**Кітаб (арабск. — кніга) — распаўсюджаны сярод беларускіх татар рукапісны зборнік розных, у асноўным рэлігійных тэкстаў, запісаных на беларускай мове арабскімі літарамі. Першыя кітабы з ´явіліся ў XVI стагоддзі, калі перасяленцы татары з Залатой Арды на беларускія землі пры вялікім князе літоўскім Вітаўце пачалі забываць сваю родную мову, і сталі карыстацца беларускай. Дзякуючы таму, што ў заснаваным на арабскай графіцы алфавіце беларускіх татар налічвалася 46 літар, гукавае адлюстраванне тагачаснай беларускай мовы ў кітабах захавалася лепш, чым у тэкстах, запісаных кірыліцай. Кітабы ўяўляюць вялікую каштоўнасць для філолагаў-беларусаведаў. Акрамя таго, яны прадстаўляюць каштоўнасць як літаратурныя творы, а летапісы — яшчэ і гістарычную каштоўнасць для сучаснікаў.**

**У мінулым нумары мы пачалі друкаваць старажытную казку з кітабу. Сёння вы можаце пазнаёміцца з яе працягам.**

# СТАРАЖЫТНАЯ КАЗКА З КІТАБУ

**(працяг)**

На трэці дзень пайшоў маладзец да палацу. Прыйшоў да дзеўчынага палацу, прывітаўся і на залатое крэсла сеў. З радасці дзеўка мувіла:

— Ай, маладзеча, хто гэта такія за стварэнні раней людзьмі былі, а цяпер звярамі сталі?

— Першы — пацук, другая малпа, затым рысь, кот, Зухра — на небе зорка, заяц, матылёк, варона, папугай, сокал, арол, воўк і слон. Усе людзьмі былі.

— З якіх прычын і такіх учынкаў пан Бог стварэннямі зрабіў?

— З той прычыны звярамі сталі: за святога Йезуса. У Ісапарока было 70 чалавек няверных. Тады пан Йезус паваpaціў іх на веру праўдзівую. Даў яму пан Бог на яго прароцтва так мувіць, каб хворых калек лячыў, сляпых відушчымі рабіў, мёртвых уваскрашаў, абы яго прароцтва пазналі. А тыя 70 людзей пана Бога не ведалі і ў яго прароцтва не верылі, мувілі: «Лыгун, чараўнік». **Варона.** Адна дзеўка была, дачка Адамава. Два кавалера сапернічалі, адзін другому ўчынкі чынілі і прасілі пана Бога, каб ні таму, а ні таму не дасталася. Тады пан Бог варонаю абярнуў. **Івалга. Адна жонка была, называлася Саліта. Як мужык спаць пойдзе, то яна ўцякала да чужых мужыкоў. За гэта пан Бог івалгай абярнуў. Заяц.** Таксама жонка была, бяз мужняга дазволу хадзіла, дзе сама хацела. Тады пан Бог абярнуў. **Мыш.** Таксама жонка вельмі ліхая, сварлівая, нідзе не маўчала. Тады пан Бог мышшу абярнуў. **Павук.** Таксама адзін чалавек быў, з мёртвых пахаваных людзей адзёжу здзіраў. Тады пан Бог павуком абярнуў. **Матылёк.** Жонка была, прыгожая хадзіла, звала чужых мужыкоў, а свайго не любіла. За тое пан Бог матыльком абярнуў. **Цвыркун.** Крыўднік чалавечы быў, лыгун і злодзей. Тады пан Бог казулькаю благою абярнуў. **Сыч.** Таксама адзін гаспадар быў, над людзьмі здзекаваўся, то пан Бог сычом абярнуў. **Воран.** Адзін чалавек вялікі лыгун быў, за тое яго пан Бог воранам абярнуў. **Руды павук.** Мужны чалавек быў, але праўду ў крыўду пераўтвараў і дзевак на блуд падштурхоўваў. а за тое пан Бог благою казулькай абярнуў. **Арол.** Таксама мужны. Пан Бог зрабіў яго каралёмфараонам, а ён людзей крыўдзіў, не звяртаў увагі на пана Бога. За тое пан Бог арлом абярнуў. **Слон.** Такі чалавек быў, што ў людзей жывёл адымаў.

Маладзец праз тры дні аб чым дзеўка пытала, на кожну рэч адповедзь даў. І мувіў:

— Ай, дзеўка! Яшчэ я ў цябе адну рэч спытаю. Ці адкажаш ты мне? А калі не адкажаш, тады таксама твая галава ўпадзе і пад замкам на кол узбіта будзе.

— Добра, я на тое згодна, альбо твой верх будзе, альбо мой.

— Ай, дзеўка! Хто такі — маткаю адзеўся, а на бацьку паехаў, а потым смерць да яго прычапілася, адзін падарожнік прынёс, а пан Бог з ласкі сваёй абараніў яго ад той смерці? То мая загадка.

Дзеўка мысліла, але не магла таго ні адным спосабам адказаць і адгадаць. І мувіла:

— Ай, маладзец! Праўда, не давялося мне ведаць такога вучонага і мудрага, як твая міласць і мудрасць. Былі ў мяне розныя вучоныя. Ні адзін са мною не мог патрафіць у навуцы і ў дыспутах. Прашу цябе, дай мне час хаця б да раніцы. А калі не адкажу, тады твая воля будзе, як захочаш, так учыніш.

Маладзец мувіў: «Добра»,— і пайшоў сабе да бабінага дому. Дзеўка ў вялікім смутку заставалася і мувіла сама сабе: «Мой божа, што мне рабіць? Пайду да малайца і буду пытаць у яго загадку. Калі скажа мне, тады раніцаю, адгадаўшы, укажу яму галаву адсячы і на кол узбіць. А затым дзеўка ўбралася непазнавальна і маладзец не смуткаваў, быў вясёлы, думала, як на дзеўку паглядзіць, дык і розум страціць. Набрала з сабою рознага напітку і адзення, але пан Бог малайцу ў кожнай рэчы памочнікам быў. Пайшла дзеўка да бабінага дому і закалаціла ў дзверы. Баба выйшла праціў дзеўкі. Дзеўка мувіла:

— Ай, баба! Дазволь мне ў хату ўвайсці.

— Уваходзь здарова.

Увайшла ў хату. Маладзец паглядзеў на дзеўку і кажа:

— Здарова прыйшла, як рання зорка. Што за патрэбу маеш? Чаго прыйшла?

— Я ў цябе закахалася, для таго і прыйшла. Усе людзі кажуць, што маладзец вучоны, і мудры, і прыгожы, што нашу гаспадарчыну перагадаў, а яна сама падобна на каралеўну.

— Будзь здарова. Шмат прыгожых ёсць.

— Тады дзеўка твар свой адкрыла. Маладзец як глянуў, нічога яму на памяць не прыйшло, бо такая дзеўка вельмі прыгожая. Немалы час яны бавілі. Пілі, елі, смяяліся, жартавалі адзін з другім. Потым дзеўка кажа:

— Калі пана Бога баішся, скажы мне, чаго буду пытаць.

— Што ж такое?

— Паведай мне сваю загадку.

— Мая загадка каля цябе. Такая мая загадка: я абяднеў. За няволю бацькі і маткі ўзяў каня і кажух. Паехаў. У дарозе аднаго малайца пытаў: »Дзе едзеш?» Ён мувіў: «Да таго замку лісты маю». Тыя лісты да сябе ўзяў, і яго назад вараціў.

Дзеўка на тыя рэчы адказаць не магла. Выпытаўшы ўсё дасканала, пайшла яна да палацу. Маладзец устаў рана, зразумеў, што дзеўка тая самая была і кажа так:

— Ай, галава бедная, баліць мая душа.

Пазней агледзеўся каля сябе, аж бачыць, дзеўчын пярсцёнак на пасцелі ляжыць. Маладзец і кажа: «Яшчэ рыцар не загінуў, калі дзеўчын пярсцёнак знайшоў». Пярсцёнак залаты, вочка— камень дыямент, на камні панны імя выразана. Маладзец пярсцёнак узяўшы, пайшоў яшчэ да палацу. Да панны прывітаўся і мувіў так:

— Няхай табе пан Бог дасць век доўгі.

— Ай, маладзец! Вось я скажу тваю загадку: бацьку ўчыніў канём, а матку — кажухом. І ў дарозе едучы, аднаго падарожніка сустрэў, конь у яго стаміўся. А ты пытаў: дзе едзеш? Падарожнік мувіў: «Да таго замку лісты вязу». І ты казаў: «Дай мне тыя лісты. Усё роўна еду да таго замку, лісты падам, бо мой конь свежы, а сам назад вяртайся». Падарожнік лісты падаў, а сам назад вярнуўся. А ты мувіў: «Не дам так я лісты, пабачу, што ў лістах піша: «Хто б тыя лісты да таго замку падаў, таму галаву адсекчы і на кол узбіць »,— гэта твая загадка. «Ай, маладзец, ні адна галава не будзе бяспечна». І мувіла слугам: «Да бацькі справадзьце і бацьку скажыце, што я малайца пераспрэчыла».

І выправадзілі малайца да гаспадара і абвясцілі гаспадару, што ўжо дзеўка малайца пераспрэчыла. Маладзец рэк:

— Пане гаспадару! Маю адно слова паведаць да вас.

— Што маеш казаць?— гаспадар спытаў.

Некаторыя мувілі да гаспадара: а што ён скажа цяпер, перад смерцю. Хіба што без справы будзе мувіць? Гаспадар кажа:

— Ён гэтулькі дзён размаўляў з дзеўкаю, можа і зараз мне паведае што слушнае.

Маладзец пачаў мувіць так:

— Пане гаспадару! Сённяшняй ноччу адзін голуб з дзяўчынінага палацу выляцеў і, летучы, зверху рознымі каменнямі сыпаў. І прыляцеў да майго начнога стану, да бабінага дому. Я яго схапіў і ў руцэ трымаў, і што хацеў, тое з ім чыніў. А затым ён з рук маіх вырваўся і паляцеў назад да дзеўчынага палацу. За то пану Богу хвала, што мне пяро засталося,— гэта і ёсць маё слова.

— Ай, маладзеча! Пакажы мне тое пяро!

Маладзец паказаў дзеўчын пярсцёнак. Гаспадар ўбачыў, аж дзеўчын пярсцёнак. Тады вельмі ўстурбаваўся і зараз наказаў дзеўцы прад сабою стаць і казаў:

— Ай, лыгун людскі! У малайца знаходзіцца пярсцёнак твой. Хто занёс да малайца?

Дзеўка кажа:

— Прынясі мне ў той момант пярсцёнак свой, пабачым. А малайца вольным зраблю.

Дзеўка з вялікага страху варацілася назад да палацу і наказала ў тую ж гадзіну залатара клікнуць. І кажа:

— Мілы мой залатару! Зрабі мне ў тую ж гадзіну такі і такі пярсцёнак. Што захочаш за пярсцёнак, тое дам табе. Пярсцёнак залаты, вочка — камень дыямент.

Залатнік адказаў: «Будзе за адну гадзіну»,— і зрабіў пярсцёнак такі, які і той быў. На камені выразана дзеўчына імя. Дзеўка дала залатару тысячу залатых і прасіла, каб не «аславіў» людзям і ў тую ж гадзіну пайшла да палацу бацькінага. Бацька ўзяў пярсцёнак. А ў гаспадара былі на той час розныя паны і бачылі абодва пярсцёнкі дзеўчыны. Але той стары, а гэты новы, бачылі абодва, што па аднаму і таму ж узору роблены. Усе людзі: і паны, і люд паспаліты, і цэлы двор, чэлядзь — усе прызналі, што абодва пярсцёнкі дзеўчыны. Але той стары, а гэты новы,— сведчылі перад гаспадаром. Гаспадар кажа:

— Ай, дачка! Аддам цябе за таго малайца. Як ён вучонага і ў розуме дасканалага, другога такога не маеш.

І ўсе паны радзілі аддаць за таго малайца. Тады гаспадар чыніць за таго малайца. Да шлюбу пайшлі. Сем дзён веселле было. Поўныя катлы ежы былі, на сурме сурмілі дзень і ноч. Як правадзілі малайца ў пакой да панны, яшчэ сем начэй дыспутавалі, елі і пілі, адзін другому адказвалі і адзін у другога пыталі: што гэта такое, што не мае ні рук, ні ног, і без душы, а языкі два. Тое чуючы, многа людзей дзівілася яго мудрасці і навуцы, і адзін другому паведалі: гэта пяро, якое піша слова божае. Пан Бог пяром пісаў «Ал-хемду», раздзел Карана. І яшчэ адзін другому казалі: «Што за пяць пажыткаў пан Бог стварыў, а тыя пажыткі нідзе не бачна, а тры ніколі сонца не бачылі. Гэта на дзень пяць намазаў. А тыя, што сонца не бачылі — Себах, Ахмаш і йецці-намаз. А два пажытка сонца бачылі: адзін «Аўле», другі «Акіндэ»-намаз. Летам і зімою волю божую спаўняюць.

Сёмага дня да згоды прыйшлі. Кароль малайца зрабіў гаспадаром і сваім сынам, бо толькі адну дачку меў. Паны ўсе радаваліся, што такі вучоны і разумны чалавек. І зрабілі яго гаспадаром-каралём. Розныя людзі прыходзілі дзеля справядлівасці. Судзіў справядліва, убогім дапамагаў. Да бацькі і да маткі лісты пісаў, што ўжо з ласкі божае каралём і гаспадара зяцем стаў. Бацька і матка, тое ўчуўшы, пану Богу хвалу далі і зараз свайму пану казалі:

— Пане гаспадару! Той маладзец, які нас прадаў тваёй міласці, то наш сын. Прыйшла вестка,— дасталі лісты, паказалі гаспадару.— Пойдзем, калі нам дазволіш, да сына нашага.

— Гаспадар кажа:

— Я вам дарую і на божую дарогу вызвалю.

Тады яны гаспадарскія рукі цалавалі і выехалі ў дарогу, і прыехалі да сына свайго і там век свой скончылі.

(Аллах ведае лепей праўду).

**Пераклад і літаратурная апрацоўка Ю. КРЫНІЦКАГА, І. АНІКЕВІЧ.**

**ГЭТА ЦІКАВА**

# ШТО ГОД НАСТУПНЫ НАМ РЫХТУЕ?

Ужо некалькі тысячагоддзяў астралогія захапляе людзей. У старажытнасці зоркам прыпісвалі магічную сілу, лічылі, што з ´явы навакольнага свету і лёсы людзей залежаць ад узаемадзеяння і ўзаемаразмяшчэння планет і зорак.

Маштабы распаўсюджання астралогіі сёння пашыраюцца. Людзі праяўляюць усё большую цікавасць да гараскопаў, задыякальных знакаў, розных прадказанняў. Вось і мы вырашылі напярэдадні новага года, які па ўсходняму гараскопу носіць назву **Казы (барана),** прычым, года белай казы, расказаць, што ж год наступны нам рыхтуе.

У год Казы можна дазволіць сабе некаторыя капрызы. Адпраўляйцеся на вёску, акружайцеся сябрамі... У палітычных і фінансавых адносінах можна блізка падыйсці да катастрофы, але ўсё будзе выратавана і раўнавага вернецца пакрыху, незалежна ад некаторай адсутнасці разважнасці і кампетэнтнасці. Год, спрыяльны ў асноўным для артыстаў, у прыватнасці, для камедыйных. Лёс будзе ўдачны Козам, якія нарадзіліся ў дзень без дажджу.

**Пацук** (1912, 1924, 1936, 1948, 1960, 1972, 1984) — ён будзе ізноў падымацца па схілу і паспяхова, можа прысвяціць сябе мастацтву.

**Бык** (1913, 1925, 1937, 1949, 1961, 1973, 1985) — дрэнны год. Ён будзе неспакойным і хмурым.

**Тыгр** (1914, 1926, 1938, 1950, 1962, 1974, 1986) — няхай ён адправіцца ў кругасветнае падарожжа. Гэта яго адзіны шанс.

**Кот** (1915, 1927, 1939, 1951, 1963, 1975, 1987)— маленькія непрыемнасці года Казы не пагражаюць яго спакою, ён будзе шчаслівы.

**Дракон** (1916, 1928, 1940, 1952, 1964, 1976, 1988)— год адпачынку. Яму лепей далей трымацца ад усёй гэтай некампетэнцыіі.

**Змяя** (1917, 1929, 1941, 1953, 1965, 1977)— яе мудрасць з цяжкасцю перанясе гэта вар ´яцтва. Яна забудзе пра гэта, бадзяючыся па прытонах.

**Конь** (1918, 1930, 1942, 1954, 1966, 1978, 1990)— ён будзе супрацiўляцца, але ўсё ідзе выдатна.

**Каза** (1919, 1931, 1943, 1955, 1967, 1979, 1991)— усё цудоўна. Ёю займаюцца, яна адчувае, што ёй паслана цудоўнае будучае. Няхай яна скарыстае гэты год.

**Малпа** (1920, 1932, 1944, 1956, 1968, 1980)— яна будзе інтрыгаваць, сядзець на двух крэслах адразу і добра пазабавіцца.

**Сабака** (1926, 1934, 1946, 1958, 1970, 1982)— яна перайшла ад раздражнення да адчаю. Яна рызыкуе адасобіцца і закончыць свае дні ў адзіноцтве, калі яна старая.

**Певень** (1921, 1933, 1945, 1957, 1969, 1981)— ён перайшоў ад раздражнення да адчаю. Рызыкуе адасобіцца і закончыць свае дні ў адзіноцтве, калі ён стары.

**Свіння** (1932, 1923, 1935, 1947, 1959, 1971, 1983)— поўная надзей. Ёй усё гэта здаецца нязначным, у адносінах фінансаў усё ідзе добра, у галіне пачуццяў усё мяняецца да лепшага.


Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 8480
2000 экз.

Рэдактар
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.